**Білет 23**

**Практычнае заданне.**

**Гаспадарчае развіццё беларускіх зямель у XIV–XVIII стст.**

**Выкарыстоўваючы прадстаўленыя матэрыялы, адкажыце на пытанні (выканайце заданні):**

1. У якім стагоддзі на тэрыторыі Беларусі з'явілася магдэбургскае права? Які горад атрымаў яго першым?
2. Якія галіны гаспадаркі развіваліся на беларускіх землях у XVIII ст.?
3. Састаўце параўнальную табліцу «Прыватнаўласніцкія і дзяржаўныя мануфактуры на тэрыторыі Беларусі». Выявіце агульнае і адрозненні.
4. Што стрымлівала развіццё і прыватнаўласніцкіх, і дзяржаўных мануфактур на тэрыторыі Беларусі ў XVIII ст.? Сваё меркаванне растлумачце.

**I. Гарады і мястэчкі, якія атрымалі магдэбургскае права да канца XVI ст.**




**II. З'яўленне мануфактурнай вытворчасці** *(па матэрыялах вучэбнага дапаможніка «Гісторыя Беларусі, XVI– XVIII стст. 7 клас»).*

У XVIII ст. новай з'явай у эканоміцы беларускіх земляў было зараджэнне мануфактурнай вытворчасці. Нізкі прыбытак ад сельскай гаспадаркі змушаў землеўладальнікаў шукаць новыя шляхі павелічэння прыбыткаў. Адным са спосабаў стала стварэнне ў магнацкіх маёнтках *мануфактур*. Мануфактуры сталі ствараць у прыватных мястэчках, каб абысці цэхавыя абмежаванні. Ініцыятарам з'яўлення першых вотчынных мануфактур у 1720–1730-я гг. стала Ганна Кацярына Радзівіл.

Першымі ёю былі заснаваны шкляныя мануфактуры ў Налібоках і Урэччы. Для іх арганізацыі яна запрасіла майстроў з Германіі. Яны павінны былі наладзіць

вытворчасць і навучыць мясцовых майстроў. Апошніх Г.К.Радзівіл адбірала са сваіх прыгонных сялян.

Танная сыравіна і высокая цана на прадукцыю забяспечылі высокія даходы іх уладальніцы. Прадукцыя шкляной мануфактуры ў Налібоках была разлічана на розныя катэгорыі пакупнікоў. Тут выраблялiся бутэлькі, посуд, шыба, даступная нават сялянам. Аднак прыгонныя сяляне былі слабымі пакупнікамі прадукцыі мануфактур.

У Рэчы Паспалітай адчувалася вострае запатрабаванне ў прамысловай прадукцыі, неабходнай для арміі і флота. Будаўніцтва першых дзяржаўных мануфактур у 1766–1768 гг. пачаў А. Тызенгаўз - адміністратар каралеўскіх эканомій. Мануфактурамі кіравалі кваліфікаваныя майстры з краінаў Заходняй Еўропы. З-за межаў краіны прывозіліся таксама абсталяванне і большая частка сыравіны. Усяго ў каралеўскіх эканоміях было створана больш за 20 суконных, металаапрацоўчых, шліфавальных і іншых прадпрыемстваў. Асноўнымі пакупнікамі прадукцыі дзяржаўных мануфактур былі каралеўскі двор і войска.

## III. Картасхема. Эканоміка Беларусі ў XVIII ст.

